ТЭРЫТОРЫЯ АДКАЗНАСЦІ

АГУЛЬНАЕ — НЕ ЗНАЧЫЦЬ НІЧЫЁ

Хто клапоціцца пра раён па ўласнай ініцыятыве?

Здаўна так павялося, што ўсе маштабныя задачы ў невялікіх населеных пунктах вырашаліся талакой. У многіх вёсках гэтыя традыцыі захаваліся і па сённяшні дзень. А вось у гарадах, асабліва буйных, суседзі часта не гатовыя і словам адзін з адным перакінуцца, не кажучы ўжо аб сумеснай працы. Аднак пакуль ёсць тыя, хто з усіх сіл супраціўляецца падобнай тэндэнцыі, сітуацыя не такая безнадзейная. Адзін з прыкладаў — камітэты тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, або КТГСы.

Хата не з краю

Гэта грамадскія аб'яднанні, члены якіх па ўласнай ініцыятыве, без аплаты, робяць усё магчымае, каб стварыць у сваім раёне як мага больш камфортныя ўмовы жыцця. У сталіцы, напрыклад, яны дзейнічаюць ужо больш за 20 гадоў, цяпер іх колькасць тут дасягае практычна паўтары сотні. Стварацца такія аб'яднанні ў Мінску пачалі, натхніўшыся прыкладам Масквы. Дарэчы, там іх дзейнасць лічыцца паўнавартаснай працай, за якую супрацоўнікі атрымліваюць грошы. У нас жа членамі арганізацыі кіруе не імкненне зарабіць, а жаданне жыць лепш.

Першапраходцам па ўкараненні гэтага новаўвядзення стаў Фрунзенскі раён. Тут жа, у мікрараёне Каменная Горка-1, знаходзіцца і КТГС №128, праўда, яго можна назваць яшчэ маладым — яму ўсяго шэсць гадоў. Увесь гэты час арганізацыяй кіруе **Аляксандр Уладзіміравіч НЕТУК** — чалавек энергічны, які не прывык прыкрывацца фразай «мая хата з краю». Грамадзянская актыўнасць абумоўлена багатым жыццёвым вопытам: у мужчыны дзве вышэйшыя адукацыі (інжынерная і педагагічная), за плячыма вайна ў Афганістане, праца ў сістэмах энергетыкі, будаўніцтва і ЖКГ. А вось да тэмы тэрытарыяльнага самакіравання ён прыйшоў практычна выпадкова. Стаў загадчыкам кааператыва ў сваім жа доме, абавязкі выконваў не фармальна, а адказна. За ўвесь час толькі ў адным шматпавярховіку ўдалося вырашыць больш за дзвесце праблем. Аляксандра заўважылі і прапанавалі пашырыць «зону» актыўнасці: арганізаваць у мікрараёне, які толькі зараджаўся, КТГС. У выніку арганізацыя неаднойчы станавілася найлепшай па розных паказчыках не толькі ў раёне, але і ў горадзе.

Мікрараён Каменная Горка–1.

На самай справе далучыцца да работ камітэта можа любы неабыякавы мясцовы жыхар. Праўда, звяртаюцца сюды часцей за ўсё старэйшыя па доме, пад'ездзе, старшыні кааператываў. Добра, калі яны па «сарафанным радыё» перадаюць інфармацыю далей. Знайсці звесткі аб камітэтах можна на сайце адміністрацыі раёна.

Ні больш ні менш

У полі зроку членаў арганізацыі вялікая колькасць праблем: ад замены лямпачкі ў пад'ездзе да арганізацыі масавых мерапрыемстваў. І ўсё ж асноўная ўвага прыпадае на абслугоўванне жылога фонду. Аляксандр Нетук прызнаецца, што пасля з'яўлення кантакт-цэнтра ЖКГ задачы крыху спрасціліся. Але гэта датычыцца толькі праблем, якія не патрабуюць неадкладнага ўмяшання. У экстранных выпадках прысутнасць пасрэднікай структуры толькі тармозіць працэс.

У сваёй працы старшыня камітэта раўняецца ні больш ні менш на Еўропу, дзе падобныя арганізацыі — рухаючая сіла ў вырашэнні многіх тэрытарыяльных пытанняў.

— Я заўсёды на сувязі, нават падчас адпачынку. Калі быць даступным толькі ў дні прыёму, толку не будзе, — адзначыў Аляксандр Нетук. Ужо некалькі гадоў ён спрабуе знайсці месца, дзе можна будзе праводзіць агульныя сходы, бо свайго памяшкання, акрамя кабінета, дзе раз на тыдзень праходзіць прыём, у камітэта няма. Вуліца для такіх задач, натуральна, не падыходзіць. Як варыянт — актавая зала ў школе, праўда, за яе арэнду неабходна заплаціць, а зрабіць гэта арганізацыі, у якой няма артыкулаў даходаў, вельмі цяжка.

> Стварацца такія аб'яднанні ў Мінску пачалі, натхніўшыся прыкладам Масквы. Дарэчы, там іх дзейнасць лічыцца паўнавартаснай працай, за якую супрацоўнікі атрымліваюць грошы.

У цэлым штодзённыя тэмы правільнага размяшчэння пешаходных дарожак, бяспекі дзіцячых пляцовак, вывазу смецця, чысціні пад'ездаў паступова ператвараюцца ў руціну, спраўляцца з якой — прывычная рэч. Зараз у цэнтры ўвагі Аляксандра Уладзіміравіча больш глабальныя пытанні, у прыватнасці «Закон аб зваротах грамадзян». Падрыхтаваны шэраг прапаноў па яго дапрацоўцы, паколькі сёння зварот у пэўную арганізацыю не абавязкова цягне за сабой адказ менавіта ад яе. Зварот можа пераадрасоўвацца некалькі разоў, што, па-першае, відавочна не паскарае працэс, а па-другое, не гарантуе рашэння.

Правільны рух

Не так даўно мікрараён Каменная Горка-1 стаў героем навін у СМІ. Прычына ў абмеркаванні будаўніцтва скразной чатырохпалоснай дарогі, якая будзе весці да буйнога гандлёвага цэнтра наўпрост праз дваровую тэрыторыю.

— За два гады мы напісалі больш за дзесяць зваротаў, дайшлі да Дзяржстандарта! — тлумачыць нерацыянальнасць такога рашэння з прафесійнага пункту гледжання член КГТС, архітэктар Рыгор Пінчук. — Там жа дзеці гуляюць! Цяпер чакаем канчатковага рашэння.

Яшчэ адзін галаўны боль арганізацыі — паркоўкі. Машыны, пакінутыя на зялёнай зоне, заносяцца ў спецыяльную базу. Аляксандр Уладзіміравіч прызнаецца, што не можа з абыякавасцю глядзець на тое, як руйнуюць плады яго працы, знішчаючы ўласнаручна высаджаныя клумбы. Калі з парушальнікамі не ўдаецца дамовіцца падобрасуседску, ён гатовы і ў Дзяржаўтаінспекцыю патэлефанаваць. Бо самакіраванне — гэта далёка не сінонім усёдазволенасці.

Але дзе паркавацца? Месцы сапраўды ў дэфіцыце, бо забудоўшчыкі імкнуцца загрузіць тэрыторыю па максімуме. Як варыянт — падземны паркінг, дзе адно месца будзе каштаваць каля 20 тысяч долараў. Зразумела, такі варыянт у доме не эліт-най забудовы не задавальняе практычна нікога. Пагаворваюць, што ў будучыні маштабны парковачны цэнтр можа з'явіцца ўздоўж кальцавой. Але зрухаў пакуль няма. Нават у такім маладым раёне, як Каменная Горка, вырашыць пытанне амаль немагчыма: уся тэрыторыя размеркаваная пад будучае будаўніцтва, кожны ўчастак улічаны. Атрымліваецца, праблема значна глыбейшая, паўплываць на яе можна толькі на заканадаўчым узроўні. І ў старшыні камітэта ёсць сваё меркаванне наконт гэтага:

— Неабходна адмяняць нарматывы 30-гадовай даўніны, калі машына была яшчэ прадметам раскошы. Паркоўкі трэба будаваць з разліку як мінімум адно месца для кожнай кватэры.

Так што члены камітэта бяруцца за вырашэнне любога пытання, бо сваім умоўным дэвізам лічаць фразу: «А хто, калі не мы?»

Дар'я КАСКО. *kasko@zviazda.by*

Извещение о повторном аукционе 28 августа 2017 г. по продаже объектов недвижимости в г. Пинске

Наименование объекта	Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-54077 «Цех строительных металлоконструкций»	Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-54078 «Цех изготовления металлоконструкций»	Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-54080 «Заготовительный цех»	Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-44659 (здание компрессорной с прилегающими сооружениями и инженерными сетями
Номер лота	1	2	3	4
Местонахождение объекта	г. Пинск, ул. Калиновского, 11И-1	г. Пинск, ул. Калиновского, 11И-2	г. Пинск, ул. Калиновского, 11Г-2	г. Пинск, ул. Калиновского, 11П
Тип помещения	Совмещенное с другим изолированным помещением	Совмещенное с другим изолированным помещением	Совмещенное с другим изолированным помещением	Отдельно стоящее
Общая площадь (кв. м)	3982,2	4516,7	3351,5	539,0
Площадь земельного участка для обслуживания строения (га)	1,444		3,574	
Начальная цена продажи	206 828,90	234 471,39	230 554,37	67 418,89
Сумма задатка	20 682,90	23 447,15	23 055,45	6 741,89
Условия продажи	Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством	Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством	Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством	Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством
Характеристика объекта, площадь земельного участка (кв.м), решение об отводе земельного участка	Одноэтажное, состоит из 3-х пролетов по 2160 м² каждый. В состав входит: покрасочное отделение с локальными очистными сооружениями, водопроводная сеть – 127,4 м, канализация фекальная – 91,5 м, ливневая канализация – 143,4 м, линия электропередач – 593 м, беседка, бетонное покрытие – 2290,2 м². Ввод в эксплуатацию 1973 г.	Одноэтажное, состоит из 3-х пролетов по 2160 м² каждый. В состав входит: водопроводная сеть – 157,2 м, канализационная сеть – 163,3 м, линия электропередач – 593 м, беседка, бетонное покрытие – 1922,8 м². Ввод в эксплуатацию 1973 г.	Одноэтажное, в состав входит: склад пиломатериалов 1389 м², навес 284 м², водопроводная сеть протяженностью 248,9 м, асфальто-бетонное покрытие 1876 м² , бетонное покрытие 2751 м², линия электропередач (ААБЛ-10 3*95) – 200 м, ливневая канализация – 30,8 м, ремонтная мастерская, административные и санитарные помещения. Ввод в эксплуатацию 1972 г.	Одноэтажное здание. Канализационная сеть 73 м, водопроводная сеть 20,4 м, бетонное покрытие 701 м². Ввод в эксплуатацию – 1992 г.

Организатор аукциона	Ликвидационная комиссия ОАО «Пинский КСИ», ТУП «ПриБут»
Продавец аукциона	Ликвидационная комиссия ОАО «Пинский КСИ», ТУП «ПриБут»

Аукцион состоится **28 августа 2017 года в 11.00** по адресу: г. Пинск, ул. Калиновского, 11 в актовом зале.

Перечень необходимых документов:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с ОАО «Пинский комбинат строительной индустрии».

2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка: на расчетный счет ОАО «Пинский комбинат строительной индустрии» BY16BAPB30124701200210000000 в РКЦ №37 в г. Пинске филиала ОАО «Белагропромбанк» – Брестское областное управление BAPBBY21401, УНП 200305504 , срок внесения суммы задатка – по 25 августа 2017 г. включительно.

3. Индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором торгов.

4. Юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица, и их подлинники, для заверения их копий организатором торгов.

5. Представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также документ, подтверждающий его полномочия.

Организатор торгов имеет право отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона возместить затраты на оценку, организацию и проведение аукциона; подписать договор купли-продажи недвижимого имущества в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Пинск, ул. Калиновского, 11, каб. 2 с 9.00 до 15.00 по рабочим дням по 25 августа 2017 года включительно, тел. 80165-37-16-19, тел./факс (80165) 37-16-66. Контактный телефон 375-44-545-77-21.